ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛІПЕНЬ – ЖНІВЕНЬ

Віцебск

2015–2016

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень – жнівень

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2016

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : ліпень–жнівень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2016. – 34 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, 2016

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень – жнівень

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

"Культурнае жыццё Віцебскай вобласці" – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка "Хроніка падзей" уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 ліпеня па 31 жніўня 2016 года. "Хроніка падзей" таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка падпісаў прыняты Палатай і адобраны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Кодэкс аб культуры распрацаваны ўпершыню і не мае аналагаў на постсавецкай прасторы.

http://president.gov.by/ru/news_ru/view/podpisan-kodeks-respubliki-belarus-o-kulture-14082/

У Верхнядзвінскім раёне **2 ліпеня** на Кургане Дружбы адбылася 57-я сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху Беларусі, Расіі і Латвіі. У час свята прайшла цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да манумента героям-камсамольцам в. Прошкі, партызанцы-падпольшчыцы М. Пынто і Герою Савецкага Саюза Іманту Судмалісу, была арганізавана работа выставак музея Баявой славы, прайшлі культурна-спартыўныя мерапрыемствы.

http://www.d-p.by/2016/05/57-ya-godovshhina-kurgana-druzhby/

3 ліпеня адзначалася дзяржаўнае свята – **Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь**. Традыцыйна ў гэты дзень у Віцебскай вобласці, як і па ўсёй краіне, прайшлі канцэртныя і спартыўныя праграмы, народныя гулянні, выстаўкі і кірмашы. Так, у Лёзненскім раёне ў рамках святочных мерапрыемстваў адбылося свята народнай творчасці “Граюць музыкі”, турнір беларускіх побытавых танцаў “Танцуй, не ляніся!” святочны канцэрт “Белая Русь, ты мая!”, выстаўка работ мясцовых мастакоў “Город – как на картинке”, канцэртная праграма “Маладзёжны танцавальны марафон” і інш. У перадсвяточныя дні аршанцы атрымалі падарунак ад Пецярбургскага дабрачыннага фонда ў рамках сацыяльна-культурнага

У **жніўні** ў Сянно прайшлі здымкі дакументальнага фільма, які расказвае пра танкавую бітву, што адбылася ў 1941 годзе ў ваколіцах райцэнтра. Карціна стане своеасаблівым пралогам мастацкай стужкі “Сталь”, якую здымаюць кінематаграфісты з Санкт-Пецярбурга.

Витебские вести. – 2016. – 10 сент. – С. 10.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

29 ліпеня Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа завяршыў юбілейны 90-ы сезон прэм’ерай спектакля “Дзіўная місіс Сэвідж” амерыканскага драматурга Джона Патрыка. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – *Юрый Пахомаў*.

http://www.belta.by/culture/view/kolasovskij-teatr-v-vitebske-zavershaet-90-j-sezon-premjeroj-komedii-dziunaja-mis

адкрылася міжнародная сумесная выстаўка графікі і скульптуры двух смаленскіх аўтараў – *Генадзія Намяроўскага* і *Валерыя Грашчанкова*.

Аршанская газета. – 2016. – 23 ліп. – С. 5.

Віцебскі Цэнтр сучаснага мастацтва прадставіў у Музычнай гасцёўні выстаўку расійска-амерыканскага мастака “Михаил Шемякин. Иллюстрации к книге “Две судьбы” (*аўтарскія ілюстрацыі, вершы і тэксты песень У. Высоцкага, прысвечаныя аўтару і іх сяброўству*).

У Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва ў **жніўні** мастак *Аляксей Балтрушэвіч* прадставіў сваю экспазіцыю “Акварель. 37 штук”.

У Віцебскім мастацкім музеі ў **жніўні** экспанаваліся выстаўкі мастакоў *Алега Крошкіна* пад назвай “Взгляд” і юбілейная акварэліста *Мікалая Драненкі*.

Витебские вести. – 2016. – 23 авг. – С. 8.

У Полацку адкрылася фотавыстаўка, якая расказвае пра праекты, рэалізаваныя пры падтрымцы Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі. У экспазіцыі былі прадстаўлены праекты рознай тэматыкі: ад аховы навакольнага асяроддзя да захавання гістарычных і культурных традыцый. На адным баку фотастэндаў – фатаграфіі галоўных дзеючых асоб гэтых ініцыятыў, а на адваротным – інфаграфіка, якая расказвае пра тэрміны выканання, геаграфію і вынікі кожнага праекта.

Витебские вести. – 2016. – 20 авг. – С. 5.

Абласны краязнаўчы музей у **жніўні** прадставіў выстаўку паштовак, прысвечаных творчасці П’ера Агюста Рэнуара “Художник счастья”, прымеркаваную 175-годдзю французскага імпрэсіяніста.

Витебские вести. – 2016. – 16 авг. – С. 8.

25 жніўня ў музеі баявой садружнасці Расонскага раёна адкрылі выстаўку карцін прадстаўнікоў творчага руху “Митьки” г. Санкт-Пецярбурга (Расійская Федэрацыя) – *Д. Драздзецкага*, *А. Брусененкі* (*пейзажы, замалёўкі*).

Голас Расоншчыны. – 2016. – 27 жн. – С. 4.

праекта *Вячаслава Заранкова* “Созидающий мир”. Упершыню ў мастацкай галерэі В.А. Грамыкі на адзін дзень адкрылася выстаўка карцін “Беларусь вачамі рускіх мастакоў”. У гарадскім дзіцячым парку Оршы прайшоў сямейны творчы конкурс “Парад аўта-бэбі-2016”. Павіншавалі гараджан са святам і госці з г. Рыбінску (Расійская Федэрацыя) – заслужаны калектыў народнай творчасці “Карусель” і ўзорны харэаграфічны калектыў “Джамп”. У Глыбокім у гэты дзень упершыню прайшоў конкурс гітарыстаў “Струны душы”, адбылося ўрачыстае адкрыццё алеі ліхтароў, сольны канцэрт *К. Галіцынай* “Бессовестно счастливая”, працавалі выстаўкі вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, фотавыстаўка “В объектива родная Глуботчина” і інш.

У Год культуры закладзена новая традыцыя – правядзенне напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь маладзёжнага свята “Дзень вышыванкі”. Гэта сумесны праект Міністэрства культуры, БРСМ, Мінскага гарвыканкама. На творчым праекце-свяце, які праходзіў ля Палаца спорту ў Мінску, прынялі ўдзел і прадстаўнікі Віцебскай вобласці.

Веснік Глыбоччыны. – 2016. – 2 ліп. – С. 5.

9 ліпеня святочнымі мерапрыемствамі адзначыў Верхнядзвінск 630-гадовы юбілей. Гараджанам і гасцям горада былі прапанаваны праект “Проспект читающих людей”, аўтарская фотавыстаўка *С. Плыткевіча* “Прыродны комплекс “Чырвоны бор”, паказальна-гульнёвая праграма “101 спяшаецца на дапамогу”, канцэрты групы “Тяни-Толкай” і “Праект”, адбыўся конкурс “Верхнядзвінская вушыца” і іншыя мерапрыемствы.

http://www.d-p.by/2016/07/programma-prazdnichnyx-meropriyatij-slavim-gorod-rodnoj-posvyashhennyx-630-letiyu-goroda-verxnedvinska/

З **12** па **14 жніўня** адзначаў пяцьдзясят другі дзень нараджэння г. Новалукомль Чашніцкага раёна. У час свята адбыўся конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні “Зорны дождж-2016”, выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці раёна, калектыву “Дива Дэнс”, саксафаніста групы “Спасение” з г. Брэста *У. Якубовіча*, фестываль фарбаў “Холли”, святочны канцэрт Акадэмічнага ансамбля песні і танца

Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, прайшла канцэртная праграма ў рамках Рэспубліканскай грамадзянска-патрыятычнай акцыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі “Мы разам” з удзелам вядомых выканаўцаў беларускай эстрады.

http://www.novolukoml.by/news/gorod/s-dnyom-goroda.html

27 жніўня адзначыў 950-годдзе аграгарадок Чарэя Чашніцкага раёна. У рамках святкавання адбыўся канцэрт “Горжусь тобой – мой край легенд и песен”, канцэрт мастацкай самадзейнасці творчых калектываў Чашніцкага раёна “В день рождения с любовью”, вячэрні канцэрт “Для тебя пою, родная Черея”, конкурс дзіцячага малюнка на асфальце “Моя малая родина”, рыцарскае шоу “Дыхание веков” і інш.

http://www.chyrvonka.by/2016/08/programma-prazdnika-chereya/

У **жніўні** на Глыбоччыне праходзіла выязное пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў “Аб рабоце, якая праводзіцца ў Віцебскай вобласці па выкананні патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”. Сярод іншага ўдзельнікі пасяджэння пабывалі ў саборы Ражаства Багародзіцы і ў Троіцкім касцёле, агледзелі будынкі, узведзеныя ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў, наведалі выстаўку мастака Ф. Ястраба ў раённым гісторыка-этнаграфічным музеі. Завяршылася пасяджэнне знаёмствам з сістэмай работы па захаванні аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Пліскім сельсавеце. У час мерапрыемства начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама *Г. Ягоравым* было адзначана, што актуальным застаецца пытанне правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на аб’ектах, што прадстаўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

Витебские вести. – 2016. – 16 авг. – С. 3.

У **жніўні** прайшоў фінал нацыянальнага адбору на міжнародны дзіцячы конкурс “Еўрабачанне-2016”. На конкурсе Беларусь прадставіць 13-гадовы *Аляксандр Мінянок* з кампазіцыяй “Музыка маіх перамог”.

http://news.tut.by/culture/509824.html

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

1 ліпеня ў рамках мастацка-адукацыйнага праекта па гісторыі мастацтва ў прасторы “Піраміда-2” бізнес-цэнтра “Марка-сіці” адкрылася выстаўка, прысвечаная творчасці заснавальніка мадэрна ў аўстрыйскім жывапісе пад назвай “Густав Климт. Эротика. Пейзаж. Рисунок”. Наведвальнікам былі прадстаўлены 54 копіі яго твораў, выкананыя прадстаўніком віцебскай мастацкай школы, маладым мастаком Дзмітрыем Гаралевічам.

http://www.belta.by/culture/view/ijul-v-vitebske-stanet-mesjatsem-klimta-199110-2016/

Трэці па ліку міжнародны пленэр Марка Шагала прайшоў з **26 чэрвеня** па **7 ліпеня**. На яго былі запрошаны 10 мастакоў-жывапісцаў з Расіі, Беларусі, Латвіі і Германіі. На працягу двух тыдняў мастакі працавалі ў0 Віцебску, двалі майстар-класы, выязжалі ў Лёзна, Здраўнёва і Полацк. 5 ліпеня былі прэзентаваны мультфільм “Марк Шагал. Начало”, створаны нацыянальнай кінакампаніяй “Беларусфільм”, і перасоўная выстаўка, якую прадаставіла кінакампанія і Нацыянальны гістарычны музей Беларусі.

http://www.belta.by/culture/view/mezhdunarodnyj-shagalovskij-plener-vozrozhdajut-v-vitebske-198329-

У Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва ў **ліпені** прадставілі выстаўку жывапісца *Аляксандра Падалінскага*.

У культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна” ў **ліпені** адбылося адкрыццё 7-й традыцыйнай выстаўкі фотамастачак з Беларусі і іншых краін “Мир глазами женщин”.

У Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі ў **ліпені** адкрылася выстава жывапісу беларускага мастака *Фёдара Ястраба* пад назвай “Вясёлкавы след”.

У Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыкі

“Белпошта” ўстанавіў каваную паштовую скрыню. Час выемкі карэспандэнцыі ўказаны.

Са **жніўня** змяніўся статус некаторых аб’ектаў гісторыі і культуры вобласці. Згодна новаму Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей, зацверджанаму Саветам Міністраў Беларусі, будынку былога Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, які меў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці 3-й катэгорыі, прысвоілі 2-ю катэгорыю, што надало гэтаму помніку рэспубліканскае значэнне. Такі ж статус набыў і Барысаў камень XII стагоддзя ў Друі Браслаўскага раёна. Трэцяя катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці прысвоена Свята-Успенскай царкве канца XIX стагоддзя ў Браславе, храмам святога прападобнага Сергія Раданежскага ў в. Лескавічы, Успенія Прасвятой Багародзіцы ў в. Пабеда Шумілінскага раёна, а таксама пабудове 1931 года па вул. Энгельса ў Глыбокім і пушцы 1910–1930-х на тэрыторыі сядзібна-паркавага ансамбля ў в. Гарадзец Шаркаўшчынскага раёна. Статуса гісторыка-культурных каштоўнасцей пазбаўлены тры курганных могільніка ранняга сярэднявечча ў Докшыцкім раёне, будынак музычнай школы ў Лынтупах Пастаўскага раёна, частка пабудоў комплексу былой паштовай станцыі ў в. Паграбёнка Сенненскага раёна і гарадзішча ў аднайменным населеным пункце Шумілінскага раёна.

Витебские вести. – 2016. – 18 авг. – С. 20.

Мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў **жніўні** на будынку чыгуначнай станцыі Бігосава Верхнядзвінскага раёна. Адкрыццё дошкі прымеркавана да 90-годдзя вакзала і 150-годдзя пасёлка, які ўзнік дзякуючы пракладцы па тутэйшых землях чыгуначнай дарогі.

Витебские вести. – 2016. – 18 авг. – С. 20.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

19 чэрвеня ў г. Холм Наўгародскай вобласці (Расійская Федэрацыя) падвялі вынікі міжнароднага конкурсу патрыятычнай песні “Сердцем причастны”. У намінацыі “выканаўцы” адразу два першых месца дасталіся *Ліне Антохінай* і *Юліі Латковіч* (г. Орша). Сярод музычных груп лепшым прызнаны дуэт народнай студыі эстрадных спеваў “Крэатыў” гарадскога Палаца культуры “Орша”.

http://53news.ru/novosti/24275-zavershilsya-mezhdunarodnyj-konkurs-patrioticheskoj-pesni-serdtsem-prichastny-v-

У канцы **чэрвеня** ў г. Апочка (Пскоўская вобласць, Расійская Федэрацыя) прайшоў **міжнародны фестываль “Река Великая: традиции, культура, экология”**. Беларусь на фестывалі прадставіў народны фальклорны калектыў “Крыніца” Янкавіцкага сельскага Дома культуры.

Голас Расоншчыны. – 2016. – 9 ліп. – С. 3.

З мэтай абмену вопытам, умацавання сяброўства і ўзаемаразумення паміж народамі падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве г. Наваполацка з горадам Крушавац (Сербія).

Витебские вести. – 2016. – 9 июля. – С. 2.

Ансамбль народных інструментаў “Віцебскі сувенір” прадставіў вобласць на **міжнародным музычным фестывалі імя М. Глінкі**, прысвечаным 212-годдзю з дня нараджэння рускага кампазітара. Мерапрыемства адбылося ў **чэрвені** ў сяле Новаспаскае Ельніцкага раёна Смаленскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2016. – 26 ліп. – С.4.

Жыхарка Оршы *Дар’я Башкова* стала ўладальніцай вышэйшай узнагароды **міжнароднага цыркавога фестывалю дзяцей і юнацтва “Мир полон чудес-2016”**, які праходзіў у сталіцы Латвіі. Дзяўчынка займаецца ў цыркавой студыі “Фантазёры” (кір. С. *Раўкоўская*). Бронзавым медалём адзначаны і паветраны нумар “Журавли” *Нікі Хмяльковай* і *Ксеніі Курчанковай.*

Витебские вести. – 2016. – 16 авг. – С. 8.

З **29 чэрвеня** па **5 ліпеня** ў балгарскім Сазопалі праходзіў **XIII Міжнародны фестываль танца "Гармония и сила"**. Па выніках конкурсных выступленняў удзельніца аршанскага калектыву эстраднага і ўсходняга танца "Dali Maissa" *Ганна Пераломава* стала пераможцай і ўладальніцай дыпломаў I ступені ў трох намінацыях (класіка, фальклор і табла).

Телеком-экспресс (Орша) – 2016. – 3 авг. – С. 22.

21 ліпеня творчыя калектывы Віцебскага раённага Дома культуры сталі ўдзельнікамі **V Міжрэгіянальнага фестывалю творчых калектываў і выканаўцаў "Велижская волна-2016"**. Прыдзвінскі край прадставілі салісткі народнага ансамбля народнай песні "Раніца" *С. Галавач* і *А. Кісялёва*, салістка народнага інструментальна-вакальнага ансамбля "Альянс" *А. Грабеннікава*, кіраўнік і ўдзельнік народнага ВІА "Мара" *С. Гаварцоў* і *В. Сіроткін*. У святочным канцэрце, прысвечаным Дню горада, прынялі ўдзел самадзейныя артысты Альгоўскага сельскага Дома культуры – удзельнікі харэаграфічных калектываў.

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2016. – 20 жн. – С. 7.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

У аграгарадку Завозер'е Полацкага раёна **11 чэрвеня** адбылося свята народнага майстэрства, вясковай абраднасці, традыцыйных ведаў і добрасуседства "Завозерская беразуха". На свята прыехалі фальклорныя калектывы амаль з усяго Полацкага раёна: жаночая вакальная група з Астроўшчыны, ансамбль народных інструментаў "Карусель" ДШМ Полацкага раёна, народны фальклорны гурт ДШМ з аграгарадка Гомель і інш. У час святочных мерапрыемстваў адбыўся этнабатл "Танцуй, не ляніся, пакуль лапці не зваліліся!", працавала бярозавая аптэка і экспанавалася фотавыстаўка "Бярозанька-сяброўка". Фальклорны

урок выдатнай асобы "Застаўся ў сэрцы вечны след вайны", прымеркаваны 100-годдзю з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Р.М. Кудрына (*Зоркаўская сельская бібліятэка*) і інш.

На працягу **жніўня** ў бібліятэках сістэмы праходзілі мерапрыемствы ў рамках рэспубліканскай акцыі "Лета з добрай кнігай": літаратурны дыліжанс па "Чароўнай краіне Васіля Віткі" (*Іёдская сельская бібліятэка*), марафон казак (*Радзюкоўская сельская бібліятэка*), турнір знаўцаў "Мова беларуская мая" (*Германавіцкая сельская бібліятэка*) і інш.

ДУК "Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

17 ліпеня Літаратурна-музычнае свята "З чаго пачынаецца радзіма" (*сквер каля цэнтральнай раённай бібліятэкі*), прысвечнае 92-годдзю з дня ўтварэння раёна.

18 жніўня Літаратурнае падарожжа "Путешествие в мир дивных сказок" (*дзіцячая бібліятэка*).

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

Арыгінальны падарунак жыхарам Глыбокага да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь зрабілі майстры прыватнага прадпрыемства "В Ажуре" (кір. *Ю. Татарыновіч*) і работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Кветніцу, якая нагадвае кола агляду, што ў сталічным парку Чалюскінцаў, устанавілі "па-суседству" з набярэжнай возера Кагальнае. Металічная канструкцыя дасягае дзесяці метраў у вышыню, важыць амаль тону, а па форме і колеру падобная на сонца.

Веснік Глыбоччны. – 2016. – 23 ліп. – С. 8.

У **ліпені** ў Віцебску па праспекце Фрунзе побач з рэтра-вагонам трамвайнага дэпо з'явілася скульптура, якая ўвекавечыла віцебскага кандуктара. Яе аўтар – скульптар *Іван Казак*.

Витебские вести. – 2016. – 23 июля. – С. 6.

На вуліцы Леніна ў раёне плошчы Перамогі Віцебскі філіял РУП

ДУК “Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

3 ліпеня Мітынг “Беларусь. Дзяржаўнасць. Незалежнасць” (*Фарынаўская сельская бібліятэка сумесна з сельскім Саветам*).

5 ліпеня Экскурсія для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту “Выйду за околицу” да гістарычных мясцін в. Моліна (*Астроўшчынская сельская бібліятэка*).

7 ліпеня Краязнаўчая гадзіна “Полацк: дзень учарашні, дзень сённяшні” ў аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў.

16 ліпеня Майстар-клас па вырабе тапіарыя з кавы “Зачараваная кава” (*Астроўшчынская сельская бібліятэка*).

20 ліпеняў Чытацкі круіз “Вокруг света по страницам книг” (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

ДУК “Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

3 ліпеня супрацоўнікамі *цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Е. Лось* была арганізавана пляцоўка “Беларусь моя, горжусь тобою!”, на якой былі прадстаўлены стэнды з інфармацыяй аб выдатных мясцінах Беларусі, працавала выстаўка-продаж сувенірнай прадукцыі, вырабленай уручную, і кніжная выстаўка літаратуры беларускіх выдавецтваў “Кнігі маёй Радзіы” і інш.

ДУК “Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

14 ліпеня Акцыя-велапрабег “Мы за чытанне!” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у бібліятэках сістэмы прайшлі наступныя мерапрыемствы: эстафета эрудытаў для вучняў сярэдняга школьнага ўзросту “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся” (*Лужкаўская сельская бібліятэка*), інтэлектуальная гульня “Славутыя імёны Бацькаўшчыны” (*Германавіцкая сельская бібліятэка*),

калектыў “Галасы спадчыны” паказаў інтэрактыўны тэатралізаваны абрад “Вяселле па-багатырску”.

Полацкі веснік. – 2016. – 5 жн. – С. 5.

Ва ўсіх раёнах вобласці ў **ліпені** і **жніўні** праходзілі святы вёсак, на якіх ушаноўвалі старажылаў, працавітых людзей, дружныя сем’і, адзначалі юбілейныя вяселлі. Святочныя праграмы рыхтавалі супрацоўнікі і артысты СДК і раённых цэнтраў культуры. Святы адбыліся ў Аршанскім раёне (вёскі Пашына і Шугайлава), Глыбоцкім раёне (в. Гатаўшчына), Гарадоцкім раёне (г. п. Езярышча, в. Обаль), Сенненскім раёне (свята вуліцы Віцебскай “З любоўю да людзей і зямлі” ў аграгарадку Ходцы), Шумілінскім раёне (в. Обаль), Расонскім раёне (в. Забор’е, з удзелам вакальнага калектыву “Жывіца”; в. Янкавічы, канцэрт народнага фальклорнага калектыву “Крыніца”).

6 ліпеня свята народнага календара Купалле сабрала на Лясных кар’ерах лёзненцаў. Народнае гулянне ўяўляла сабой мікс з фальклорных традыцый, гумару, музыкі і спеваў. Адбылося тэатралізаванае прадстаўленне “Приключения русских бабок в купальскую ночь”, падрыхтаванае тэатрам эстрадных пародый і мініяцюр “ТЭМП”, выступілі самадзейныя артысты ДК аграгарадка Бабінавічы вакальны калектыў “Весялухі”, ансамбль народнай песні “Забава”, танцавальны калектыў “Созвездие” і інш.

Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2016. – 86 ліп. – С. 1, 6.

8 ліпеня, у дзень памяці святых благаверных князя Пятра і кнігі Феўроніі, у агарагарадку Сар’я прайшоў Дзень кахання, сям’і і вернасці. Падчас свята адбылася літургія і хрэсны ход, духоўнае свята прадоўжылася ў Сар’янскім сельскім Доме культуры, дзе былі размешчаны выстаўкі творчых работ людзей з абмежаванымі магчымасцямі ТЦСАН і майстроў гурткоў СДК, а таксама выстаўка духоўнай літаратуры. Канцэрт “Дай да сэрца сэрцам дакрануцца” прадставіў Сар’янскі СДК.

Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2016. – 12 ліп. – С. 5.

17 ліпеня на Міёршчыне ў дзясяты раз прайшоў фэст “Перабродская зорка”. У фестывалі народнай творчасці прынялі ўдзел латышскі Цэнтр беларускай культуры ў Даўгаўпілсе, таварыства “Уздым”, танцавальны гурт “Лянок” і песенны “Спадчына”, узорны ансамбль “Азярніцы” жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна. На свяце шырока была прадстаўлена дэкаратыўна-прыкладная творчасць.

Витебские вести. – 2016. – 30 июля. – С. 13.

24 ліпеня ў Лёзненскім РЦК адбыўся гала-канцэрт праекта гэтага года “Точь-в-точь”. Пераможцам конкурсу стаў *Юрый Крысак*. Дыпломы I ступені атрымалі *Аляксандр Усцінаў, Уладзімір* і *Раман Ульянавы, Аляксандр* і *Алена Шашковы*.

Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2016. – 26 ліп. – С. 1.

На пачатку **жніўня** турысты з Латвійскай Рэспублікі наведалі аграгарадок Мазалава. Узначальвала групу ў складзе 40 чалавек акадэмік Латвійскай Акадэміі навук, доктар філалогіі і прафесар Латвійскага ўніверсітэта *Яніна Курсітэ-Пакуле*. Госці пабывалі ў краязнаўчым музеі мясцовай школы, помніку архітэктуры XIX стагоддзя, мясцовых установах культуры, паслухалі беларускія народныя песні ў выкананні ансамбля песні “Крыніцы”, паўдзельнічалі у майстар-класах, наведалі выстаўку музычных інструментаў. У музеі-сядзібе І. Рэпіна “Здраўнёва” адбылася сустрэча ўз латвійскім консулам *Угісам Скуя* і загадчыцай Цэнтра нацыянальных культур Цэнтра культуры “Віцебск” *В. Шпак*.

6 жніўня ў рамках “Летняй афішы-2016” у вёсцы Шацілава Гаранскага сельсавета прайшло раённае свята Дзень вёскі з удзелам прадпрыемстваў і ўстаноў Полацкага раёна. Гасцей чакаў удзел у цырымоніі асвячэння ахоўнага крыжа ў вёсцы Шацілава, святы гасцінных гаспадароў, мудрасці і добрасуседства, “Значны дачнік” і свята калодзежа, шматлікія майстар-класы, выставы-прэзентацыі, прафілактычныя і тэматычныя акцыі. У мерапрыемствах свята прынялі ўдзел ансамбль “Полацкія россыпы” і спявак *Васіль Граноўскі*, паэтка *Людміла Дзянісава*.

Полацкі веснік. – 2016. – 16 жн. – С. 4.

ДУК “Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

3 ліпеня, у рамках святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у парку адпачынку была арганізавана выстава кветкавых кампазіцый “Красуйся, мая Беларусь!” (*удзельнікі народнага клуба кветкаводаў “Флора” сумесна з бібліятэкарамі сістэмы*). На выставе “Лёзненскія матывы” былі прадстаўлены рэпрадукцыі карцін М. Шагала, ля фантана гучалі вершы самадзейных паэтаў раёна.

18 ліпеня Літаратурная імпрэза “Асобы знакамітых беларусаў у кнігах Алеся Марціновіча”, прысвечаная 70-годдзю пісьменніка.

29 ліпеня Этнаграфічнае падарожжа “Из бабушкиного сундука” з удзелам метыдыста Дома рамёстваў і супрацоўнікаў Дома культуры (*Стасеўская сельская бібліятэка*).

30 жніўня Літаратурная гасцёўня “Гучаць чароўныя радкі”, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта, перакладчыка, дзяржаўнага дзеяча Г. Бураўкіна (*сельская бібліятэка аграгарадка Кавалі*).

ДУК “Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

9 ліпеня Літаратурны каляндар “Паэтычны зоркапад”, прысвечаны творчасці паэтаў-юбіляраў 2016 года *У. Някляева, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна* (*Лынтупская гарпасялковая бібліятэка*).

9 ліпеня Літаратурна-музычная кампазіцыя “Они цветут, сердца отогревая, как маленькие, тёплые костры…” у рамках клуба па інтарэсах “Сучаснікі” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

9 жніўня Экалагічная гульня-марафон “Запрашаем па грыбы” (*Варапаеўская дзіцячая бібліятэка-музей дзіцячай творчасці*)

29 жніўня Літаратурны партрэт “Маёй сілы крыніца – родны край Беларусь”, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Г. Бураўкіна (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

(*Бярозкаўская сельская бібліятэка-клуб*).

30 жніўня Вечар-партрэт “Шчырая вера ў Бога”, прысвечаны 65-годдзю з дня нараджэння пісьменніка-земляка Ф. Палачаніна (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

19 жніўня Вечар-сустрэча ўраджэнцаў вёскі Фесеўка “Мілы сэрцу куток” (*Расасенская сельская бібліятэка*).

25 жніўня Літаратурны партрэт “Шчодры талент зямлі Дубровенскай” (*Верамееўшчынская сельская бібліятэка*).

27 жніўня Свята вёскі Дзяцель “З любоўю да людзей і зямлі” (*Дзяцельская сельская бібліятэка-клуб*).

ДУК “Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

3 ліпеня Тэматычны вечар “Наша Беларусь – краіна міру і дабра” (*Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага*).

5 ліпеня Літаратурнае меню па творчасці А. Волкава “Книги на все времена” (*Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза*).

6 ліпеня Народнае гулянне “Папараць-кветка” (*Бароўская сельская бібліятэка*).

21 жніўня Выстаўка-віктарына “Дзе жывуць міфічныя персанажы?” у час фестывалю фальклору “У госці да Лепельскага Цмока” (*дзіцячая бібліятэка*).

28 жніўня Літаратурнае падарожжа да 80-годдзя Г. Бураўкіна “Струны сэрца чыстага” (*Горская сельская бібліятэка*).

На працягу **жніўня** ў бібліятэках сістэмы праводзіліся мерапрыемствы ў рамках праграмы летніх чытанняў “Летні кніжны лістапад”: конкурс дзіцячага малюнка “Бусы и браслеты из шкатулки лета” (*Горская сельская бібліятэка*), конкурс фантазёраў “Я знаю, я умею, я сделаю сам” (*Юркоўшчынская сельская бібліятэка*), гульнёвая праграма “Много шуток и затей для смекалистых детей” (*Поплаўская сельская бібліятэка*) і інш.

Арганізатары любімага свята браслаўчан – летняга карнавала “Улетная волна” – раённы Дом культуры і райкам БРСМ. У гэты раз **13 жніўня** на гарадскім пляжы ляпілі з пяску фігуры насельнікаў азёр і мораў, удзельнічалі ў кірмашы хэндмейда, слухалі песні ў выкананні мясцовых самадзейных артыстаў і інш. Працягам свята стаў традыцыйны **фестываль рок-музыкі “Жывое неба Браслава”**. У ім прынялі удзел пастаўскія “Скіфы”, “Fake Lab” з г. Мінска і “Atlantica” з яе арганізатарам і салістам браслаўчанінам А. Набеевым.

Витебские вести. – 2016. – 25 авг. – С. 18.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

XXV Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” прайшоў з **14** па **18 ліпеня**. У гэтым годзе музычны форум прымаў гасцей з 45 краін свету. Фестывальнымі тэмамі сталі Год культуры, тэма Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і асноўная – 25-годдзе фестывалю.

